# РАЗДЕЛ 1
# ИСТОРИЧЕСКИЕ, ФИЛОСОФСКИЕ НАУКИ, ЯЗЫКОЗНАНИЕ

## *1.1 Социально-гуманитарные дисциплины*

УДК 94(476)

### КАСЦЁЛЫ БРАСЛАЎШЧЫНЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ Ў КАНТЭКСЦЕ КУЛЬТАВАГА ДОЙЛІДСТВА БЕЛАРУСІ

***Хаданёнак В.М., к.г.н.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разглядаецца працэс культавага будаўніцтва на Браслаўшчыне ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Аналізуюцца яго адметныя асаблівасці ў параўнанні з іншымі гісторыка-культурнымі рэгіёнамі Беларусі.*

Ключавыя словы: архітэктура, культавае дойлідства, каталіцтва, касцёл, неараманскі і неагатычны стыль, рамнтызм.

Рэлігійна-культурная сфера з даўніх часоў з’яўлялася адной з найбольш прыярытэтных і важных у жыцці грамадства. На працягу стагоддзяў беларусы шмат разоў атрымлівалі каштоўную духоўную падтрымку з боку як праваслаўных, так і каталіцкіх іерархаў, святароў, манахаў. Далёка не апошнюю ролю адыгралі ў жыцці нашай краіны разнастайныя культавыя пабудовы, якія належылі розным канфесіям. Некаторыя, захаваўшыяся з пракаветных часоў храмы, і дагэтуль глядзяць на нас сваім строга-павучальным і разам з тым поўным лагоды і пяшчоты позіркам.

Культавае дойлідства займае асобае месца ў гісторыка-культурным жыцці нашага народа. Праекціроўка і ўзвядзенне храма вымагала ад дойлідаў пошуку гарманічнай сувязі, пэўнага яднання паміж архітэктурай збудавання і яго духоўным прызначэннем. Храм мусіў вылучацца сярод забудовы горада, мястэчка, альбо вёскі і ствараць атмасферу велічнасці і ўзнёсласці. Аднак архітэктура – гэта такі від мастацтва, узровень якога надзвычай моцна залежыць ад ступені развіцця вытворчых сіл, культуры пэўнага народа, краіны, рэгіёна і гэта залежнасць яскрава прасочваецца на прыкладзе Браслаўшчыны.

Даследванні храмабудаўніцтва ў Браслаўскім раёне паказалі, што праз дрэнную якасць земляў і вялікую колькасць азёраў і балот, дадзены рэгіён даволі працяглы час быў эканамічна адсталым, з недахопам фінансавых сродкаў, таму ў вёсках і мястэчках Браслаўшчыны практычна адсутнічала каменнае будаўніцтва касцёлаў. Інтэнсіўнае развіццё рэгіёну пачалося толькі ў апошнія дзесяцігоддзі існавання Расійскай імперыі.

Браслаўская ж парафія ў другой палове XIX – першай палове XX стагоддзя была адной з самых буйных па плошчы і колькасці вернікаў, а таксама адной з самых вялікіх у Ковенскай губерні. У канцы XIX стагоддзя колькасць яе вернікаў перавышала 14 тысяч чалавек.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя на Браслаўшчыне, дзякуючы пэўнаму эканамічнаму ўздыму, пачалася актыўная дзейнасць па будаўніцтву мураваных храмаў. Менавіта ў гэты перыяд замены патрабавала большасць састарэлых будынкаў, а фінансавыя магчымасці дазвалялі будаваць больш трывалыя і манументальныя. Гэтаму спрыялі і палітычныя ўмовы, у прыватнасці пэўнае змякчэнне палітыкі царызму ў адносінах да іншаверцаў (каталікоў) пасля першай расійскай рэвалюцыі [1, с. 605]. А так, як у канфесійным складзе Браслаўскага раёна большасць складалі каталікі, то гэтыя змены значна паўплывалі на будаўніцтва касцёлаў у рэгіёне.

На Браслаўшчыне ў другой палове XIX – першай палове XX стагоддзя, як і на іншай тэрыторыі краіны, у будаўніцтве касцёлаў яскрава выявіўся рамантычны накірунак, а яго ўзорным стылем стала перш за ўсё неаготыка. Браслаўскі край можна па праву лічыць своеасаблівай калыскай беларускага нацыянальнага рамантызму ў архітэктуры.

Яскравым прыкладам храмавага будаўніцтва ў стылі неаготыкі з’яўляецца касцёл

Прасвятой Троіцы ў мястэчку Відзы, які будавалі на працягу 1909–1914 гадоў па праекце вядомага архітэктара Лявона Вітана-Дубейкаўскага. Падмурак храма выкладзены з часанага каменю. Рысы неаготыкі яскрава бачныя ў вонкавым выглядзе храма: аб'ёмы кананічнай трохнефавай двухвежавай базілікі з пяціграннай апсідай, двухпавярховымі сакрысціямі і трансептам згрупаваны ў дынамічна нарастаючую архітэктурную кампазіцыю. Моцнае ўражанне пакідаюць дзве шмат'ярусныя ступеньчатыя вежы, завершаныя вострымі васьміграннымі шатрамі. Паміж вежамі знаходзіцца трохвугольны франтон. На галоўным фасадзе вылучаецца перспектыўны партал з вімпергам. Над ім – велізарнае акно-ружа, пераплёт якога выкладзены з фігурнай цэглы. Храм мае трансепт аднолькавай вышыні з цэнтральным нефам, тарцы якога ўпрыгожаны зубцамі. Алтарная частка завершана гранёнай апсідай, з больш нізкімі, таксама гранёнымі, сакрысціямі. На тарцы цэнтральнага нефа маецца невялічкая вежачка-сігнатурка са звонам. Ступеньчатыя контрфорсы, шматлікія вежачкі-пінаклі, вялізныя аконныя праёмы з востраканцовымі завяршэннямі, зубцы, вострыя шатры – усё гэта надае будынку лёгкасць, узнёсласць, падкрэслівае яго вертыкальную выцягнутасць [2, с. 58]. Эстэтычнае ўражанне ўзмацняецца насычаным чырвоным колерам адкрытай муроўкі будынка, дакладнасцю архітэктурных формаў, высокамастацкаю прарысоўкай дэталяў.

Касцёл святога Іаана Хрысціцеля ў вёсцы Опса таксама ўвасабляе сабой класічны прыклад неагатычнага стылю. Ён быў пабудаваны ў 1887 г. з цэглы і бутавага каменю па фундацыі Ф. Брыль-Плятэра і Ядвігі Цеханавецкай на месцы драўлянага касцёла. Аднанефавы храм мае адну вежу, якая выступае за плоскасць галоўнага фасада, з шатровым завяршэннем. Галоўны фасад упрыгожаны парталам з вымпергам, невялікім акном-ружай, аркатурай, паяском у выглядзе парэбрыка.

У стылі неаготыцы ў 1907 г. быў збудаваны і касцёл святога Якуба у вёсцы Пеліканы (зараз яна ўваходзіць у склад вёсцы Мілюнцы). Касцёл выкананы ў выглядзе манументальнай трохнефавай двухвежавай базілікай з трансептам. Галоўны фасад мае дынамічную вертыкальна накіраваную трактоўку, яго сілуэт фарміруюць чацверыковыя трох'ярусныя шатровыя вежы і двухсхільны шчыт паміж імі, крапаваны стральчатай аркатурай. Трох'ярусныя вежы дэкарыраваны нішамі, карнізнымі паясамі, лапаткамі, выявамі крыжоў, выкладзенымі з фігурнай цэглы, прарэзаны разнастайнымі аконнымі праемамі. У шырокай стральчатай арцы над уваходным парталам размешчана невялікае акно-ружа. Галоўны ўваход зроблены ў выглядзе вузкага тамбура. Бакавыя фасады рытмічна прарэзаны высокімі вузкімі аконнымі праемамі паўцыркульнымі завяршэннямі. Гэтыя высокія арачныя аконныя праёмы садзейнічаюць вертыкалізму храма [3, с. 267].

Другой моцнай плынню рамантызму ў архітэктуры была неараманіка, якая аднак мела больш лакальнае значэнне. Станаўленне неараманскага стылю на мяжы XIX–XX стагоддзяў – вынік зацікаўленасці грамадства і дойлідаў доўгі час забытай мастацкай культурай Еўропы. Помнікам архітэктуры неараманскага стылю з'яўляецца касцёл Божага цела, пабудаваны ў 1906–1912 гадах ў вёсцы Іказнь. Храм узводзіўся коштам збораў і прыватных ахвяраванняў. Сцены касцёла мураваны з расколатых камянёў, вонкавыя краі якіх абчэсваліся. Знізу пакладзены самыя вялікія камяні, да верху іх памеры паступова змяншаюцца. Вежы, апрацоўка аконных і дзвярных праёмаў, дэталі архітэктурнага дэкору выкананы з чырвонай цэглы. Старажылы ўспамінаюць, што камяні на будоўлю прывозілі фурманкамі з навакольных палёў, а цэглу рабілі на месцы спецыяльна нанятыя майстры [4, с. 8]. У часы пераследаў і ганенняў на рэлігію касцёл зачынілі. Ён быў моцна разбураны, бо выкарыстоўваўся як збожжасховішча і склад пад будаўнічыя матэрыялы. У 1990 г. ён зноў вернуты вернікам. Зараз у касцёле знаходзяцца абразы двух бласлаўлёных ксяндзоўпакутнікаў Станіслава Пыртка і Уладзіслава Мацьковяка, якія працавалі ў гэтай парафіі.

Касцёл Святой Троіцы ў вёсцы Плюсы быў узведзены ў пачатку XX стагоддзя. Да гэтага часу тут існаваў невялікі філіяльны храм Браслаўскай парафіі. Пабудаваны касцёл Святой Троіцы з цэглы па канону трохнефавай двухвежавай базілікі. Архітэктура храма засноўваецца на форме паўцыркульнай аркі, якая пакладзена ў малюнак уваходнага партала, трыфорыума над ім, біфорыумаў вежаў і бакавых вокнаў. Другі ярус галоўнага фасада вылучаны аркатурным фрызам, завершаны двухгранным шчытам з акном-ружай. У аздабленні будынка ўжыты лапаткі, аркатура, нішы, контрфорсы, карнізныя паясы. Аднак у цэлым дэкор касцёла стрыманы [5, с. 125].

Касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса ў вёсцы Слабодка быў пабудаваны ў 1903 г. з цэглы і атынкаваны. Ён уяўляе сабой трохнефавую двухвежавую базіліку з апсідай, трансептам і сакрысціямі, пабудаваную з цэглы і атынкаваную. Дынамічны сілуэт галоўнага фасада

фарміруюць дзве высокія пяціярусныя вежы з вострымі шатровымі вярхамі і параўнальна невялікая фасадная плоскасць цэнтральнага нефа паміж імі. Сцены прарэзаны паўцыркульнымі, лучковымі і круглымі аконнымі праёмамі з вітражамі. Над галоўным уваходам і на фасадных плоскасцях трансепта размешчаны вялікія вокны-ружы. Усе сцены раскрапаваны ступеньчатымі контрфорсамі, якія на бакавых фасадах злучаны з дэкаратыўнымі аркбутанамі [1, с.605].

Значным і даволі своеасаблівым элементам рамантычнага накірунку ў культавым будаўніцтве Беларусі было актыўнае выкарыстанне дрэва як самастойнага каштоўнага матэрыялу. Прыкладамі такіх пабудоў на Браслаўшчыне з'яўляюцца касцёлы ў вёсках Далёкія, Дрысвяты, Мяжаны. Не можа быць сумневу і ў тым, што драўляныя касцёлы Браслаўскага рэгіёна (якія спрэс і побач – аднавежавыя), з'яўляюцца тым важным чыннікам, які яшчэ больш падкрэслівае не толькі рамантычны падыход у іх будаўніцтве, але і іх нацыянальна-гістарычны каларыт.

Такім чынам на працягу XIX – пачатку XX стагоддзяў беларуская архітэктура прайшла значны шлях. У яе безумоўных дасягненнях знайшлі адлюстраванне сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і канфесійныя працэсы ў грамадстве. Зазнаўшы моцнае ўздзеянне рускай і польскай архітэктурных школаў, беларускае дойлідства тым не менш захоўвала ўласныя рысы, пераапрацоўваючы знешнія ўздзеянні, не забываючы багатыя традыцыі мінулых часоў. Дынамічнай была і яго стылявая эвалюцыя: эклектычныя накірункі, неаготыка, неараманіка, мадэрн, якія неслі ў сабе новыя рашэнні, новыя адносіны і новае адчуванне рэчаіснасці.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што рамантычны накірунак у архітэктурным будаўніцтве Браслаўшчыны ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя быў дамінуючым. А найбольш пашыранымі стылямі – неагатычны (касцёлы ў вёсках, Опса, Пеліканы і мястэчку Відзы) і неараманскі (касцёлы ў вёсках Іказнь, Плюсы, Слабодка). Варта адзначыць і тое, што Браслаўшчына вылучаецца надзвычай вялікай колькасцю базілік неараманскіх і неагатычных храмаў на фоне любога геаграфічнага рэгіёна Беларусі. Адной з найбольш адметных асаблівасцяў касцёльнага будаўніцтва Браслаўшчыны азначанага перыяду стала і вельмі шырокае выкарыстанне бутавага каменю (Опса, Браслаў, Барадзінічы, Плюсы, Іказнь).

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Гісторыка-дакументальная хроніка памяць. Браслаўскі раён. – Мн.: Паліграф-афармленне, 1998. – 709 с.
2. Чантурия, В. А. Памятники и памятные места Беларуси / В. А. Чантурия, Ю. В. Чантурия. – Смоленск: Русич, 2007. – 416 с.
3. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэкстце. У 4 т. – т. 2. – Мн.: Беларуская навука, 2006. – 626 с.
4. Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. – Мн.: БелЭн, 1993. – 620 с.
5. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін. – Мн.: БелЭн, 2001. – 216 с.


УДК 37(091)(075.8)

# СИСТЕМА ОБРАЗОВАНИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В ПЕРИОД ИХ НАХОЖДЕНИЯ В СОСТАВЕ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (НА ПРИМЕРЕ ВИТЕБЩИНЫ)


***Лученкова Е.С.[1], к.и.н., доц., Вечер Л.С.[2], к.и.н., доц.***

*[1]Витебский государственный технологический университет, г. Витебск, Республика Беларусь*

*[2]Академия Управления при Президенте Республики Беларусь, г. Минск, Республика Беларусь*



Реферат. *В статье предпринята попытка раскрыть содержание системы образования на белорусских землях в период их нахождения в составе Российской*